Падтрымай "Вясну" на PATREON

Затрыманні па ўсёй краіне на Дзень Волі: пераслед у Беларусі 25 сакавіка

дапоўнена

25.03.2021 **Тэгі**: пераслед, затрыманні



Менск, 25 сакавіка. Фота: "Радыё Свабода"

Праваабарончы цэнтр "Вясна" 25 сакавіка ў Дзень волі пільна сочыць за грамадска-палітычнымі падзеямі ў Беларусі і працягвае фіксаваць факты палітычнага пераследу: прэвентыўныя затрыманні, "прафілактычныя гутаркі", ператрусы, новыя крымінальныя справы і іншыя формы ціску на грамадзян за іх актыўную грамадзянскую пазіцыю і незадаволенасць дзеяннямі ўладаў.

Калі вас ці вашых блізкіх затрымалі, паведамляйце нам праз тэлеграм-бот @viasna_bot ці на гарачую лінію:

- **+375 44 734 45 51**
- **+375 29 835 94 49**
- Тэлеграм **@ViasnaSOS, @SOSViasna**

Усе вядомыя затрыманні па Менску — у табліцы ўнізе матэрыяла. Яна пастаянна абнаўляецца.

Гродна

Жонка актывіста непрызнанага беларускімі ўладамі Саюзу палякаў на Беларус **Анджэя Пачобута Аксана** паведаміла на свай старонцы ў фэйсбуку, што ў іх дома праводзіцца ператрус.

> *"Дома міліцыя ў балаклавах, тэлефанаваць не даюць",* - паведаміла яна. Пазней дадала, што ператрус праводзіцца ў межах крымінальнай справы за распальванне варожасці (арт. 130 Крымінальнага кодэкса).

Затрыманага ў Гродне журналіста Анджэя Пачобута даставілі ў Цэнтральны апарат СК у Мінску, дзе адбыўся допыт. Анджэй Пачобут затрыманы на 72 гадзіны ў межах крымінальнай справы, піша "БАЖ".

Тым часам Генеральная пракуратура паведаміла, што ўзбуджаная крымінальная справа ў дачыненні да старшыні незарэгістраванага ў Беларусі так званага Саюза палякаў **Анжалікі Борыс** і іншых асоб па частцы 3 артыкула 130 КК Рэспублікі Беларусь (наўмысныя дзеянні, накіраваныя на ўзбуджэнне нацыянальнай і рэлігійнай варожасці і варожасці па прыкмеце нацыянальнай, рэлігійнай, моўнай і іншай сацыяльнай прыналежнасці, а таксама па рэабілітацыі нацызму, учыненыя групай асоб).

Названыя грамадзяне, пазіцыянуючы сябе членамі вышэйпаказанага саюза, з 2018 года па цяперашні час на тэрыторыі горада Гродна і іншых населеных пунктаў вобласці з прыцягненнем непаўналетніх арганізавалі і правялі шэраг незаконных масавых мерапрыемстваў па ўшанаванні ўдзельнікаў антысавецкіх бандфармаванняў, якія дзейнічалі падчас і пасля Вялікай Айчыннай, якія здзяйснялі рабаванні, забойствы мірнага насельніцтва Беларусі, знішчэнне маёмасці. Іх дзеянні пераследвалі мэты рэабілітацыі нацызму, апраўданні генацыду беларускага народа.

Сілавікі прыйшлі таксама ў польскую грамадскую школу і сядзібу Саюзу палякаў Беларусі ў Горадні, паведамляе **Інэса Тодрык-Пісальнік**.

Таксама прыйшлі дадому да дырэктаркі грамадскай школкі пры Саюзе палякаў у Ваўкавыску **Марыі Цішкоўскай**. Пра гэта паведамляе тг-канал Белсата.

Таксама ідзе пратрус у кіраўніцы Лідскага аддялення Саюза палякаў у Беларусі **Ірэны Бернацкай.** Пасля пратрусу яе павезлі ў Мінск на допыт у Следчы камітэт. Яе хочуць дапытваць без адваката. Адвакат мусіць прыбыць праз 1,5 гадзіны. Ірэну пакінулі пад арыштам пасля допыту ў Следчым камітэце, перадае "Белсат".

> *«Гэта распачалося а 9-й гадзіне, мяне яшчэ ў офісе не было, былі людзі, якія працуюць у бюро. Прыйшлі 10 чалавек з розных аддзелаў міліцыі. Іх цікавіла ўсё, распачалі ад кожнага кабінету, на пачатку ў школе, пасля ў бюро, дзе нашая бухгалтэрыя, пасля ў рэдакцыі. Цікавіла іх усё. Усё праглядалі: кнігі, часопісы. Адразу забралі камп'ютары. І таксама праглядалі фотаапараты – іх пакінулі, але я не паглядзела, ці карткі памяці пакінулі»*, — распавяла "Белсату" пра пратрус у Саюзе палякаў Беларусі **Ірэна Валюс**, віцэ-старшыня Саюзу палякаў Беларусі.

Адбываецца пратрус у рэдакцыі пры Саюзе палякаў у Беларусі. Забіраюць газеты «Głos znad Niemna» і часопісы «Magazyn Polski», камп'ютары і абсталяванне.

У вёсцы Лунна Мастоўскага раёна затрыманы мясцовы актывіст і краязнаўца 78-лётны **Лявон Карповіч**, перадае Hrodna.life. У яго над домам вісеў нацыянальны сцяг.

Каля 15.00 два супрацоўнікі міліцыі прыйшла да **Любові Сарлай**. Яе адвезлі ў Кастрычніцкі РАУС для высвятлення інфармацыі па папярэдніх акцыяў, распавяла яна Hrodna.life.

Актывісты паведамілі Hrodna.life пра затрыманне айцішніцы **Ульяны Ляскевіч**. Яна таксама актрыса самадзейнага тэатра "Турандот".

У інтэрнаце ўніверсітэту а 9-й раніцы быў затрыманы **Дзмітры Ярэніч**.

Таксама ў Гродне затрыманы **Уладзімір Карпач**.

Салігорск

Сёння раніцай у Салігорску супрацоўнікамі міліцыі быў затрыманы гарадскі актывіст **Павал Батуеў.** Затрыманне праводзілі супрацоўнікі Следчага камітэта РАУС г. Салігорска.

Таксама дома АМАП затрымаў ўдзельніка стачкаму "Беларускалія" **Дзмітрыя Аляксандравіча Караку**. Таксама прайшлі вобшукі ў некаторых іншых страйкамаўцаў Беларускалія.

Затрыманая гарадская актывістка **Іна Гарадская**.

Слуцк

Затрыманы жыхар Слуцка **Андрэй Крот**. Папярэдняя прычына затрымання — выявы "Пагоні" і бел-чырвона-белыя сняжынкі на вокнах. Ён знаходзіцца ў мясцовым РАУС. Таксама ўчора, 24 сакавіка, праз бела-чырвона-белы сцяг і "Пагоню" на прыватным участку быў затрыманы **Уладзімір Фёдаравіч Кульбіцкі**, вёска Лучнікі Слуцкага раёна.

Рэчыца

Сёння ў СК Рэчыцы выклікаюць журналіста **Андрэя Мядзведзева** і праваабаронцу **Валера Пуціцкага**. Іх статус у позве не пазначаны. Можна меркаваць, што допыт звязаны з крымінальнай справай па ч.2 арт. 342 Крымінальнага кодэксу. **UPD**: а 19.00 з імі па-ранейшаму няма сувязі.

З раніцы супрацоўнікі міліцыі дзяжурылі пад пад'ездам **Аляксандры Бахцінавай**, калі яна выйшла з дому і села ў таксі і паехала да свайго адваката ў будынку ФСАН, яны пераследавалі яе на машыне. Ёй хацелі ўручыць позву на прафілактычную гутарку, яна адмовілася. Супрацоўнікі міліцыі камусьці тэлефануюць, нікога не адпускаюць. Дзяўчына дачакалася адваката і ў яго прысутнасці адмовілася размаўляць з міліцыяй. Але сілавікі схапілі яе за руку і прымусілі праехаць у РАУС. Аляксандру адпусцілі ў 6 вечара, пратрымалі гадзін 5, выклікаюць заўтра раніцай у міліцыю зноў.

Віцебск

У Віцебску затрыманы вядомы апазіцыянер і дысідэнт **Барыс Хамайда,** піша Белсат**.** Ранкам 25 сакавіка ён выйшаў да легендарнага ў Віцебску «сіняга дому» ў цэнтры гораду на адзіночны пікет з выявай герба «Пагоня». Гэткім чынам хацеў павіншаваць віцяблян з Днём Волі. Ужо праз некалькі хвілін да яго падышлі людзі ў форме МУС. Зараз Барыс Хамайда знаходзіцца ў Чыгуначным РАУС Віцебску. Пазней яго адпусцілі.

Таксама на сувязь у Віцебску перасталі выходзіць **Крысціна Юдзіна, Канстанцін Смолікаў, Алесь Вендт, Іван Казлоў, Руслан Яневіч.**

Магілёў

Магілёўскі праваабаронца і актывіст **Аляксандр Хамратаў** паведаміў, што яго затрымліваюць супрацоўнікі міліцыі ў масках. Падрабязнасцяў затрымання няма, перадае MAYDAY.

У Магілёве затрымалі **Віктара Шаўцова і Аляксандра Лісоўскага.**

Магілёўца **Арцёма Кармазіна** забралі з працы людзі ў форме АМАП у балаклавах, паведамляе MAYDAY. У дадзены момант яго месцазнаходжанне невядома. У райаддзелах міліцыі Магілёва заяўляюць, што такога чалавека ў іх няма.

У горадзе затрыманая **Вольга Захарава**. Паводле інфармацыі крыніцы MAYDAY, яна патэлефанавала сваёй непаўналетняй дачцэ а 18:26 і сказала, што яе затрымалі.

Брэст

Вядомы сваёй БЧБ-прычоскай жыхар Берасця **Андрэй Прыстаўка** паведаміў, што яго затрымалі:

> *“А мяне зноў вязуць на 13 содняў, якія я ўжо адсядзеў...”* – паспеў напісаць ён у тэлеграме.

Пазней стала вядома, што перад Андрэем выбачыліся і адпусцілі.

На выхадзе з дому затрымалі журналістаў-фрылансераў **Мілану Харытонаву** і **Алеся Ляўчука**. Іх збіраюцца везці ў Маскоўскі РАУС, паведамляе "Белсат". У Міланы ёсць няпоўнагадовая дачка. Увечары іх адпусцілі на волю. У іх забралі тэлефоны. Пратаколы не складалі.

Вілейка

Чытачы з Вілейкі паведамляюць, што ў цэнтры горада міліцыя затрымала вілейчука **Андрэя Кудзіка.**



Момант затрымання Андрэя Кудзіка.

Масты

У вёсцы Луна Мастоўскага раёну сёння затрыманы мясцовы актывіст і краязнавец **Лявон Карповіч**. Яму 78 год. У яго над хатай вісеў нацыянальны сцяг. Правялі пратрус, забіралі ўсё з нацыянальнай сімволікай, нават «Пагоню». Павезлі ў Масты. **UPD**: а 19.15 стала вядома, што Лявон Карповіч вызвалены да суду. Заўтра ў Мастах пенсіянера будуць судзіць за пікетаванне.

Горкі

Праз камэнтар на суддзю, які караў пратэстоўцаў да трох чалавек у Горках прыйшлі з пратрусамі і забралі тэхніку.

Зняважлівыя выказваньні у адрас судзьдзі Горацкага суду **Аляксандра Зайцава** нібыта з'явіліся ў сацыяльных сетках. Пад падазрэньне трапілі актывісты, якіх затрымлівалі за ўдзел у леташніх пратэставых акцыях.

У **Андрэя Юркова, Наталлі Даронінай і Ларысы Самсонавай** у межах крымінальнай справы забралі тэлефоны, кампутары, носьбіты інфармацыі, а таксама фотаапарат, паведамляе "Радыё Свабода-Беларусь".

Міёры

Затрыманая **Наталля Іванаўна Радос**. На дадзены момант знаходзіцца ў РАУС г. Мёры. Суд прызначаны на 26 сакавіка.

Ляхавічы

У Ляхавічах Берасцейскай вобласці затрымалі трох мужчынаў: **Анатоля Куліка, Генадзя Вішнеўскага, Вадзіма Булатага**, **Віктара Лойку, Сяргея Шэстака, Андрэя Банкевіча, Яўгена Нікуліна, Віталь Чарняўскі**. Анатоль Кулік не так даўно перанёс інсульт. Генадзь Вішнеўскі — пенсіянер. Анатоля Куліка і Генадзя Вішнеўскага выпусцілі з РАУС у Ляхавічах.Аднак там застаюцца астанія затрыманыя.

Гомель

У Гомлі затрыманы актывіст **Ігар Краўчанка**, які нядаўна адседзеў 30 сутак за фотаздымак з БЧБ-сцягам. Таксама затрыманы актывіст **Ілля Міронаў,** але пазней яго адпусцілі на волю.

Маладзечна

У горадзе затрымалі маладзечанцаў **Яўгена Радзівілку** і жонку палітвязня Паўла Пяскова **Вераніку Французаву**.

Дзесяць футбольных фанатаў затрымалі ў Маладзечне за пратэсты ў жніўні, піша прэс-служба МУС. Яны прызнаныя падазраванымі па крымінальнай справе аб арганізацыі групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або ўдзеле ў іх (артыкул 342 КК). Усе затрыманыя знаходзяцца ў ІЧУ.

Затрыманы **Аляксандр Зуеўскі**. А 18-й гадзіне ў яго кватэры прайшоў вобшук. Сам Аляксандр цяпер знаходзіцца ў РАУС.

Крупкі

У Крупках затрымалі 61-гадовага пенсіянера **Васіля Лапаціна**. Прайшоў 200 м з БЧБ-сцягам на плячах. Пад'ехаў бус: выскачыла каля пяці міліцыянтаў. Не прадстаўляліся. Двое падхапілі пад рукі, хутка павялі ў бус. Даставілі ў РАУС і склалі пратакол па арт. 24.23 КаАП. Адпусцілі і сказалі, што заўтра суд.

Смалявічы

У Смалявічах затрымалі Целяша Глеба 1973 года нарадэння. Затрымалі днём як раней затрыманага па 23.34 КаАП для размовы з кіраўніцтвам РАУС. Яго трымалі да 19 гадзін і адпусцілі без папер.

Бабруйск

У Бабруйску затрымалі **Сяргея Бяляева, Уладзіміра Міхалапа, Алену Дурманенка, Дзяніса Носава** (карэспандэнт газэты "Вячэрні Бабруйск"; ўвечары быў адпушчаны), **Ірыну Сурыгіну, Аляксея Данілейку, Аляксандра Парахневіча.**

Таксама "Бабруйск Online" паведамляе аб затрыманні **Мікіты Назарава** і **Паўла Кабанчука**. Па словах яго жонкі, вечарам даішнікі спынілі аўтамабіль Паўла. Дадому ён у той вечар так і не вярнуўся.

Пінск

У Пінску на вуліцы затрымалі актывіста **Аляксандра Рамановіча**. Яго даставілі ў РАУС, дзе ў вуснай форме правялі тлумачальную размову і адпусцілі.

Копыль

У Копылі сёння затрымалі **Ігара Ляцкага.**

Навагрудак

У Навагрудку сёння выклікалі на "прафілактычныя гутаркі" **Ірыну Трафімік, Мікалая Журу, Уладзіміра Істрацькова, Уладзіміра Буйко, Вольгу Аляшкевіч, Алега Какошу, Германа Несцера.** Усіх адпусцілі пасля размовы.

Дзяржынск

У Дзяржынску затрымалі **Аляксандра Куніцкага**.

Дуброўна

У мясцовай актывісткі **Наталлі Стрэльчанка** прайшоў ператрус. Канфіскавалі камп'ютар і тэлефон.

Усе вядомыя затрыманні па Менску — у табліцы. Яна пастаянна абнаўляецца.

Список задержанных : 25 сакавіка

	A	B	C	D
1	ФИО задержанного/задержанной	Дата рождения	РУВД, куда доставили	Коммен
2	Абдулин Егор Салаватович	1983		
3	Агафонова Мария Петровна	1994		
4	Агеев Илья	2000	Фрунзенское РУВД	
5	Агеенко Сергей Анатольевич	13.01.1961		Мать на иждиве
6	Айзатулин Рустам			Травматолог-ор
7	Алейник Евгений Иванович			
8	Антонова Галина Захаровна		Первомайское РУВД	
9	Аргер Денис Леонидович	08.08.1980	Партизанское РУВД	
10	Асаула Ульяна Сергеевна		Фрунзенское РУВД	
11	Астапович Анастасия Александровна	23.10.2000	Октябрьское РУВД	Задержана возл
12	Баранчук Сергей Сергеевич		Партизанское РУВД	
13	Бартенева Елена Владимировна			
14	Белковская Лариса		Партизанское РУВД	
15	Белозорович Ольга			Обыск
16	Белоокий Сергей Чеславович			
17	Березкин Роман Валерьевич		Московское РУВД	
18	Бибиков Руслан Викторович	1982		
19	Бокуть Сергей Игоревич			
20	Болдин Виктор			Обыск провел Д
21	Бондарева Людмила	08.06.1979	Ленинское РУВД	
22	Борисенко Марина Николаевна		Октябрьское РУВД	
23	Брагинец Екатерина Дмитриевна		Фрунзенское РУВД	
24	Бруй Александр Александрович	10.09.1989	Ленинское РУВД	
25	Буйко Тимур Сергеевич		Октябрьское РУВД	
26	Бурак Константин Викторович		Октябрьское РУВД	Несовершенно
27	Буралкин Павел Владимирович		Октябрьское РУВД	
28	Валенцевич Андрей Александрович	2002		Задержан на Пу
29	Ванюков Семён Викторович	22.09.1986		Задержали окo

25 сакавіка

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 922 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh











E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

